Я, Седышова Марыя Сяргееўна, вымушана звярнуцца да Вас, рэктара ГрДУ імя Янкі Купалы, з нагоды важнай праблемы, якая мяне, як студэнтку 2 курсу фізіка-тэхнічнага факультэта ГрДУ імя Янкі Купалы, вельмі моцна турбуе.

У верасні 2021 года я пачала заўважаць прысутнасць чужых людзей у нашым корпусе, на якіх спачатку не звяртала асаблівай увагі, паколькі ў корпусе фізіка-тэхнічнага факультэта размяшчаецца яшчэ і інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў ГрДУ ім. Янкі Купалы.

Крыху пазней маю ўвагу прыцягнуў той факт, што заняткі больш не праводзяцца ў тых аўдыторыях, у якіх яны праводзіліся раней. Стала заўважна, што колькасць навучальных аўдыторый скарацілася, а адпаведна, скарацілася і прастора, у якой студэнты маглі б існаваць.

Пазней сталі хадзіць чуткі аб тым, што наш корпус належыць нейкаму аб'яднанню, якое займаецца арганізацыяй канцэртаў, свят і мерапрыемстваў.

Спачатку мне не хацелася ў гэта верыць, бо самае важнае правіла, на маю думку, якое павінен выконваць кожны студэнт, выкладчык і супрацоўнік універсітэта - гэта падтрымліваць дысцыпліну, парадак, а самае галоўнае - выконваць цішыню падчас заняткаў.

Крыху пазней чуткі часткова пачалі пацвярджацца: падчас заняткаў, замест таго, каб канцэнтравацца на тым, што кажа выкладчык, мне даводзілася слухаць розныя незразумелыя гукі, якія зыходзілі з суседніх памяшканняў і адцягвалі маю ўвагу ад важнай інфармацыі. Сярод найбольш яркіх магу адзначыць стук, музыку, грукат і спевы ў мікрафон.

І тут маё ўяўленне аб універсітэце – вышэйшай навучальнай установе, у якой кожны павінен выконваць дысцыпліну, быць максімальна сканцэнтраваным і настроеным на навучальны лад, не супала з рэальнасцю - тым месцам, у якім я вучуся.

Акрамя таго, хочацца адзначыць, што дысцыпліны, якія я вывучаю, з'яўляюцца вельмі складанымі і няпростымі, а таксама патрабуюць вакол адпаведнай абстаноўкі і вялікіх намаганняў для разумення. Студэнтам неабходна быць максімальна засяроджанымі і сканцэнтраванымі на занятках, а таксама на тым, што гаворыць выкладчык. Вырашаючы задачы і прыклады з вышэйшай матэматыкі, студэнты павінны быць пагружаны з

галавой толькі ў гэтыя задачы і прыклады, не адцягваючыся на староннія гукі.

Шчыра кажучы, мне, як студэнтцы фізіка-тэхнічнага факультэта, вельмі складана вучыцца ў такіх умовах.

Я лічу, што спевы і грукат падчас заняткаў - рэчы, несумяшчальныя з фізіка-тэхнічным факультэтам.

За ўвесь час навучання на фізіка-тэхнічным факультэце я ні разу не парушала дысцыпліну, заўсёды выконвала цішыню падчас заняткаў, праяўляючы такім чынам павагу да выкладчыкаў і аднагрупнікаў. Акрамя таго, з 01.12.2021 года набылі моц новыя Правілы ўнутранага распарадку для навучэнцаў установы адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы», з якімі я, як і ўсе мае аднагрупнікі, канешне, азнаёмілася. Больш за ўсё лічу неабходным звярнуць увагу на «Глава 4. Обязанности обучающихся:

41. В зданиях, помещениях, учебных аудиториях, общежитиях и в иных местах, а также на прилегающей Университету территории запрещается:

41.6. кричать, шуметь, играть на музыкальных инструментах, пользоваться звуковоспроизводящей аппаратурой с нарушением тишины и созданием помех по осуществлению учебного процесса».

Таксама трэба адзначыць, што на працягу ўсёй вучэбнай дзейнасці дадзены пункт ні разу не быў мною парушаны. І як мне здаецца, усе пералічаныя ў пункце 41.6 дзеянні, павінны забараняцца не толькі навучэнцам, але і ўсім выкладчыкам, супрацоўнікам і іншым асобам, якія знаходзяцца ў будынках, памяшканнях, навучальных аўдыторыях, інтэрнатах і ў іншых месцах, а таксама на прылеглай Універсітэту тэрыторыі. Бо ўсе гэтыя дзеянні перашкаджаюць нармальнаму ажыццяўленню навучальнага працэсу.

Таксама адзначу, што фізіка з'яўляецца для мяне навукай, якой я хачу прысвяціць большую частку свайго жыцця. У будучыні я планую працаваць выкладчыкам ва ўніверсітэце ці настаўнікам у школе. Для гэтага мне неабходна атрымаць адпаведную адукацыю, да чаго я, уласна, і імкнуся. Я стараюся добра вучыцца, заўсёды выконваю дысцыпліну і правілы ўнутранага распарадку. І мне вельмі хацелася б, каб і ўніверсітэт, у якім я атрымліваю адукацыю, падаў мне ўсе неабходныя - спрыяльныя і

камфортныя - умовы для паўнавартаснага ажыццяўлення вучэбнай дзейнасці.

Акрамя таго, я, як студэнтка 2 курса фізіка-тэхнічнага факультэта ГрДУ ім. Янкі Купалы, хацела б даведацца адказаў на хвалюючыя мяне пытанні:

1) Па якой прычыне адбываецца ўсё тое, што было пералічана і апісана мною вышэй?

2) Каму належыць корпус фізіка-тэхнічнага факультэта?

3) Кім з'яўляюцца людзі, якія выдаюць такія дзіўныя гукі падчас навучальных заняткаў?

4) Як студэнтам вучыцца ў такіх умовах?

Таму, звяртаюся да Вас, рэктара ГрДУ ім. Янкі Купалы, з мэтай атрымаць адказы на гэтыя пытанні.

Загадзя дзякуй!

З павагай, студэнтка 2 курса фізіка-тэхнічнага факультэта.